ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 6 (944) | АЎТОРАК, 24 сакавіка 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Навукова-практычная канферэнцыя

## АД ЭКАЛОГІІ ЗАЛЕЖЫЦЬ БУДУЧЫНЯ

17-19 сакавіка на базе біялагічнага факультэта нашага універсітэта праходзіла I Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Экалогія і моладзь". Яе арганізатарамі былі Міністэрства адукацыі, ГДУ імя Ф.Скарыны, Інстытут лесу Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт транспарту, Гомельскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя. Канферэнцыя аказалася даволі прадстаўнічай. Удзел у яе рабоце прынялі вучоныя і спецыялісты з Беларусі, Расіі і Украіны. Працавала 8 секцый. Заслуханыя і абмеркаваныя на іх даклады і паведамленні адлюстроўвалі даследаванні экасістэмы ва ўмовах радыеактыўнага і тэхнагеннага забруджвання акаляючага асяроддзя. Менавіта пераадоленне наступстваў чарнобыльскай трагедыі, паступовае паляпшэнне экалагічнай сітуацыі -- тая вельмі важная праблема, ад вырашэння якой залежыць наша жыццё і лёс будучых пакаленняў.

Матэрыялы з праведзенай канферэнцыі будуць надрукаваны ў наступным нумары нашай газеты.

Тыдзень камп'ютэрных навук

## У ДРУГІ РАЗ — ЛЕПШ

На базе матэматычнага факультэта ў другі раз (упершыню — у сакавіку мінулага года) праводзіўся Тыдзень камп'ютэрных навук (Gomel Computer Sciene Week/GCSW'98), да ўдзелу ў якім запрашаліся выкладчыкі, студэнты і школьнікі ўсіх навучальных устаноў г.Гомеля і вобласці, а таксама фірмы, зацікаўленыя ў развіцці камп'ютэрных тэхналогій у рэгіёне.

У рамках GCSW'98 адбыліся выстаўка прадукцыі фірм, звязаных з камп'ютэрнымі тэхналогіямі, навукова-тэхнічная канферэнцыя для студэнтаў і аспірантаў "Новыя камп'ютэрныя тэхналогіі ў навуцы, тэхніцы, вытворчасці і індустрыі забаў", конкурс праграмных прадуктаў, распрацаваных у Гомелі — Gomel-Soft'98; алімпіяда па праграміраванню (2 індывідуальныя туры і 1 камандны тур) для студэнтаў і школьнікаў па дзвюх катэгорыях (прафесіяналы і пачынаючыя).

Асаблівую цікавасць у школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта выклікала выстаўка прадукцыі вядучых на беларускім рынку фірм у галіне ўкаранення новых камп'ютэрных тэхналогій: "ТАИР", "ГАЛАКТА", "СПРИНГС", "АСБИС", "Компьютеры и периферия", "ШАНЦ", "ДАЙНОВА", "САПРМАШ", "ЭЛМИС" і "ТЕХНОТРОНИК".

Значная роля ў тым, што гэта выстаўка адбылася, належыць членам аргкамітэта GCSW'98 студэнтам V курса матфака Уладзіміру Гурыку, Андрэю Сапунову і трэцякурсніцы гэтага ж факультэта Ірыне Рэут.

Навукова-тэхнічная канферэнцыя праводзілася па чатырох секцыях: інфарматызацыя кіравання вышэйшай навучальнай установай; аўтаматызацыя праектавання мікрапрацэсарных сістэм; праблемы матэматыкі і інфарматыкі; інфарматызацыя вытворчых працэсаў.

Усяго было заслухана і абмеркавана каля 80 дакладаў. Актыўны ўдзел у канферэнцыі прынялі не толькі студэнты і аспіранты ГДУ, але і госці з Мінска, Барысава і іншых гарадоў рэспублікі.




У конкурсе праграмных прадуктаў свае распрацоўкі прадставілі супрацоўнікі, аспіранты і студэнты матэматычнага факультэта, а таксама госці з розных навучальных устаноў Гомеля і Мінска.

Пераможцамі алімпіяды па праграміраванню сталі: сярод студэнтаў — Ігар Коршунаў і Аляксей Талкачоў (другакурснікі матэматычнага факультэта), сярод школьнікаў: 11 клас — Сяргей Лагвіненка, 10 клас — Вячаслаў Удавічэнка, 9 клас — Дзмітрый Шалагін (усе трое з гарадскога ліцэя), 8 клас — Яўген Ганчар (СШ N61), 7 клас — Таццяна Кірычэнка (СШ N66), 6 клас — Сяргей Таццяненка (СШ N61), 5 клас — Раман Дзвінкоўскі (СШ N61), а таксама каманда матэматычнага факультэта ГДУ ў складзе Ігара Ганчарэнкі (ПМ-24), Данілы Дзегцярова (ПМ-14) і Сяргея Лагвіненкі.

У алімпіядзе па праграміраванню ў агульнай складанасці прынялі ўдзел 99 студэнтаў і школьнікаў. Гэта стала магчымым дзякуючы выкарыстанню камп'ютэрных сетак і сучасных праграмных сродкаў для перадачы заданняў ад журы да ўдзельнікаў і рашэнняў ад удзельнікаў у журы. У сваіх класах такім чынам працавалі вучні СШ NN 8, 27, 61, гарадскога і абласнога ліцэяў, за што неабходна выказаць падзяку настаўнікам інфарматыкі гэтых навучальных устаноў І.С.Барысенка, А.М.Філінскаму, Л.С.Ганчар, Г.А.Савідавай і І.В.Ульянавай, А.Л.Міняйлавай і С.Г.Русакову. Праверка рашэнняў хутка і якасна ажыццяўлялася з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы тэсціравання праграм, якую распрацаваў студэнт I курса матфака Арцём Кузняцоў. Словы ўдзячнасці трэба адрасаваць таксама настаўнікам і вучням, якія вымушаны былі працаваць у сваіх камп'ютэрных класах, а браць умовы і перадаваць рашэнні на дыскетах (СШ NN 11, 60, 66), дзе выкладаюць інфарматыку адпаведна М.В.Барысенка і Н.Г.Ціханава.

**У.АРЛОЎ, дэкан матэматычнага факультэта,**
**М.ДАЛІНСКІ, начальнік ІВЦ.**

## НАША ЗДАРОЎЕ І ЧАРНОБЫЛЬ

Час ідзе, выяўляючы тыя змены ў здароўі насельніцтва нашай вобласці, якія звязаны з тэхнагеннай катастрофай ХХ стагоддзя — аварыяй на ЧАЭС. Вучоныя працягваюць свае даследаванні аб уплыве радыяцыйнага абпраменьвання на жывыя арганізмы.

На мінулым тыдні многія выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты універсітэта мелі магчымасць паслухаць у актавай зале пазнавальную лекцыю "Аддаленыя вынікі аварыі на Чарнобыльскай АЭС: ацэнка праз 12 гадоў". З ёй выступіла доктар біялагічных навук, загадчыца лабараторыі антымутагенезу Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Р.І. Ганчарова.

## ДЗЕСЯЦЬ ГОД З ІМЕМ Ф.СКАРЫНЫ

Як вядома, пастановай Савета Міністраў БССР N349 ад 29 лістапада 1988 г. нашаму універсітэту прысвоена імя Францыска Скарыны. У сувязі з гэтым газета "Гомельскі універсітэт" артыкулам ст.выкладчыка ўсеагульнай гісторыі Яўгена Броўкіна (чытайце на 3-й стар.) адкрывае новую рубрыку "10 год з імем Ф.Скарыны". Пад ёй рэдакцыя мае намер публікаваць усе матэрыялы і асвятляць мерапрыемствы па падрыхтоўцы да самага бліжэйшага нашага юбілею. Святкаванне яго адбудзецца ва ўрачыстай абстаноўцы. Падрыхтоўка ідзе поўным ходам. Распрацоўваюцца мерапрыемствы. Урачыстасці пройдуць у лістападзе. У гэтыя дні адбудуцца III рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Ф.Скарына і наш час", сустрэчы студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта з пісьменнікамі і паэтамі, якія ўнеслі значны ўклад у стварэнне мастацка-літаратурнага вобразу Ф.Скарыны. Апагеем свята стане ўрачыстае адкрыццё помніка Ф.Скарыну, які падораны нашаму універсітэту вядомым актывістам грамадска-культурнага жыцця рэспублікі А.Я.Белым. Аўтар помніка -- старэйшы скульптар рэспублікі, член Саюза мастакоў Беларусі Сяргей Аляксандравіч Адашкевіч. Само адкрыццё будзе праходзіць пад акампанемент тэатралізаванага прадстаўлення "Дыялогі і маналогі Ф.Скарыны з Гісторыяй".

**К.УСОВІЧ, загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

## З УЗНАГАРОДАЙ !

***За дасягнутыя поспехі ў вучэбна-выхаваўчай і навуковай рабоце, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і ў сувязі са святам -- Днём жанчын Ганаровымі граматамі ўзнагароджаны:***



Рэктар Л.А.ШАМЯТКОЎ уручае Ганаровую грамату дацэнту кафедры філасофіі Т.П.ГАРАНІНАЙ. Фота У.ЧЫСЦІКА.

**БАННІКАВА** ЛюдмілаСцяпанаўна -- загадчыца кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы;

**СВІРЫДЗЕНКА** Валянціна Рыгораўна -- дацэнт кафедры хіміі;

**ЧОБАТАВА** Зінаіда Іванаўна -- ст. выкладчыца кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту;

**ЦУРГАНАВА** Людміла Антонаўна -- асістэнт кафедры ВМ і праграміравання;

**ЯЗЭПАВА** Тамара Ігнатаўна -- дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;

**ГАРАНІНА** Тамара Пятроўна -- дацэнт кафедры філасофіі;

**КАРПЕЙ** Тамара Васільеўна -- заг. кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, дэкан эканамічнага факультэта;

**КОЦУР** Валянціна Віктараўна -- лабарант II катэгорыі кафедры геаэкалогіі;

**КАСЦЮЧЭНКАВА** Валянціна Малахаўна -- дырэктар бібліятэкі;

**КРУЧКОВА** Ніна Дзмітрыеўна -- заг. аддзела бібліятэкі;

**САЛЬНІКАВА** Лілія Канстанцінаўна -- заг. аддзела бібліятэкі;

**КУРАВА** Іраіда Антонаўна -- галоўны бухгалтар;

**БЕЛЬЧАНКА** Вера Лявонцьеўна -- намеснік галоўнага бухгалтара;

**ПАПКОВА** Ніна Іванаўна -- начальнік вучэбнага аддзела;

**АЛЕЙНІК** Юлія Дзмітрыеўна -- кіраўнік вытворчай практыкі вучэбнага аддзела;

**ЖЭМЧУГОВА** Валянціна Пятроўна -- метадыст вучэбнага аддзела;

**МЯТЛІЦКАЯ** Марыя Міхайлаўна -- сакратар-машыністка рэктарата;

**АЗЯЎЧЫКАВА** Ганна Уладзіміраўна -- нам. галоўнага бухгалтара;

**ВАЙЦІШКІНА** Аляксандра Лаўрэнцьеўна -- ст. выкладчыца кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў;

**ВІШАНКОВА** Антаніна Альбертаўна -- інжынер-матэматык I катэгорыі ІВЦ;

**СОЦІЕВА** Тамара Міхайлаўна -- дырэктар "Прадпрыемства грамадскага харчавання";

**ЕЛІСЕЕВА** Ірына Міхайлаўна -- дацэнт кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі;

**(Заканчэнне на 2 стар.)**

## *ГАНАРОВЫЯ ГРАМАТЫ -- ЮБІЛЯРАМ*

За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **ПРАЦКО Юрый Піліпавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

***

За шматгадовую плённую вучэбна-метадычную і трэнерскую работу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, навуковую дзейнасць, праявленне спаборніцтвах розная ўзроўню і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння ст. выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **КІРЭЕЎ Валерый Канстанцінавіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.



**Леонид Александрович Шеметков родился в Гомеле. В 26 лет он стал кандидатом физико-математических наук, в 31 - доктором. С 1980 года --член-корреспондент Национальной академии наук. В течение многих лет возглавляет Гомельский государственный университет имени Ф.Скорины. Создал в Гомеле крупную научную школу, среди его учеников 4 доктора и 27 кандидатов наук.**

**В январе текущего года состоялась встреча Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко с ректорами высших учебных заведений, в которой принял участие и ректор ГГУ. На встрече разгорелась дискуссия - в который раз за последние годы! - о путях развития отечественной науки.**

# Леонид ШЕМЕТКОВ АКАДЕМИЯ ПРИРАСТАЕТ ВУЗАМИ

**- Леонид Александрович, наш Президент предлагал свою концепцию организации науки в республике?**

-Александр Григорьевич концепций не выдвигал и свою точку зрения не навязывал. Он спрашивал нас, ученых, как должна строиться государственная политика в отношении науки, какова должна быть модель взаимодействия вузовской и академической науки.

**- Как я понимаю, на сегодняшний день существуют различные точки зрения на пути решения этой проблемы. Они принципиально отличаются друг от друга?**

- Кратко можно ответить так: сколько людей, столько и мнений. Все согласны с тем, что государство должно поддерживать лучших ученых, поощрять и финансировать научные исследования. Но как это сделать? Вот в этом вся проблема. И тянуть с ответом нельзя, потому что в настоящее время в парламенте идет обсуждение проекта закона «О Национальной академии наук». В нем речь идет и о вузовской, и об академической науке.

**- Что же обеспокоило вузовских ученых?**

- В проекте закона предусматривается сделать Национальную академию наук руководителем всей белорусской науки во всех фундаментальных научных направлениях. Однако, чтобы это намерение не стало лишь добрым пожеланием, необходима, на мой взгляд, структурная перестройка самой академии. Она должна превратиться в организацию, объединяющую всех ученых.

**- Все это, Леонид Александрович, так. Тем не менее наука советского периода, структура, которая досталась нам, признана во всем мире.**

- Вы коснулись истории. Тогда давайте углубимся в нее вплоть до царствования Петра I. Создавая в 1724 году Академию наук, он указывал, обратите на это внимание, что в ряде европейских стран академии и университеты не связаны друг с другом и в этом их слабость. Примечателен также следующий исторический факт: когда петербургскую Академию наук освободили от обязанности подготовки студентов и научных кадров, она быстро замкнулась в себе, отмежевалась от университетской профессуры, выступила с отказом от приложений научных достижений к практическим потребностям общества. Поэтому в России стали возникать - жизнь заставила! - профильные научные общества, к концу XIX века их насчитывалось 340. А в советский период проблема интеграции вузовской и академической науки не решалась по двум причинам. Во-первых, изменилась роль самой академии наук, ее значение для военно-промышленного комплекса все время возрастало. Во-вторых, у Советской власти было достаточно средств, чтобы развивать и академию наук, и вузы. Сегодня мы себе такой роскоши позволить не можем, поэтому те средства, которые выделяются на науку, надо использовать эффективно.

**- У вас есть конкретные предложения?**

- Они вытекают из новой роли Национальной академии. Она должна стать государственной научной организацией, обеспечивающей развитие и поддержку науки в масштабе всей республики. Вы спросите, как этого достичь, если сейчас в академических институтах представлены далеко не все имеющиеся в республике научные направления, не все ведущие ученые являются работниками академии? Давайте изменим точку зрения на то, что такое член академии. Предлагаю в законе о Национальной академии наук записать следующее: ее членом имеет право быть любой гражданин Республики Беларусь, изъявивший желание быть членом академии, выполняющий требования ее устава и регулярно уплачивающий членские взносы. Если закон с такой формулировкой будет принят, то проблема интеграции вузов и академии, не решенная с петровских времен, попросту исчезнет.

**- Надо полагать, тогда изменится статус академиков и членов-корреспондентов?**

- Они будут членами академии, но только более высокого ранга. В проекте закона о Национальной академии наук предлагается название «академик» и «член-корреспондент» считать учеными званиями. С одной стороны, это не совсем удачно, так как по традиции ученые звания (например, звание профессора) присваиваются лицам, которые имеют право претендовать на занятие должности с тем же названием. С другой стороны, существует многовековая мировая практика, согласно которой словами "бакалавр", "магистр", "доктор" обозначается степень учености. Поэтому член-корреспондент и академик, конечно, ученые степени.

**- Но тогда встанет вопрос: сколько же должно быть академиков и членов-корреспондентов?**

- Самое главное - это должны быть авторитетные ученые. Кроме того, необходимо, чтобы члены-корреспонденты и академики представляли все научные направления. Можно поручить Высшему аттестационному комитету составить перечень научных направлений и разработать требования к претендентам на высшие ученые степени.

**- Изменится ли в предлагаемой вами модели система управления наукой?**

- Никаких новых органов управления наукой вводить не потребуется. Высшим органом академии, как и сейчас, будет ее общее собрание, право решающего голоса на котором должны иметь только ее действительные члены, т.е. академики и члены-корреспонденты.

**- Высшая ученая степень, помимо прочего, предусматривает широкую эрудицию ученого. Хотелось бы знать, кто для вас по этой части является примером?**

-Академик Б.В.Бокуть, который до меня возглавлял наш университет. Мне посчастливилось много лет работать под его руководством, и я считаю его своим учителем. Борис Васильевич Бокуть поражал своей эрудицией не только в области «своей» науки, но и в области литературы, живописи, истории.

**- Последний вопрос. Может ли, к примеру, известный писатель или художник стать академиком?**

- Формально - нет, поскольку ныне действующий устав Национальной академии наук предписывает академику и члену-корреспонденту «обогащать науку новыми достижениями и открытиями». В то же время в нашей академии есть отделение гуманитарных наук и искусств, членами которого являются выдающиеся творческие личности. Этот парадокс не устраняется и проектом нового Закона. Поэтому необходимо Национальной академии придать статус «наук и искусств», либо создать отдельно Академию искусств. Я отдал бы предпочтение первому варианту, поскольку культура неделима.

***Вел интервью Владимир БОНДАРЕНКО.***

***От «Р». Проблема, один из путей решения которой предлагает Леонид Шеметков, безусловно, волнует не только научную общественность страны. Вот почему мы готовы предоставить страницы для конструктивной дискуссии об оптимальной модели взаимодействия вузовской и академической науки и государственной политике в этом отношении.***

**("Рэспубліка" за 11 сакавіка 1998г.)**

# З УЗНАГАРОДАЙ !

**(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)**

**ЖАЛОНКІНА** Тамара Пятроўна -- ст. выкладчыца кафедры агульнай фізікі;

**ГАДЛЕЎСКАЯ** Ганна Мікалаеўна -- дацэнт кафедры оптыкі;

**МАКСІМЕНКА** Ніна Кузьмінічна -- вядучы інжынер-матэматык ІВЦ;

**КАДОЛ** Таццяна Паўлаўна -- вядучы інжынер-матэматык ІВЦ;

**ПАШУК** Святлана Яўгенаўна -- начальнік планава-фінансавага аддзела;

**ЛЮБЕЗНАЯ** Вольга Васільеўна -- вядучы эканаміст планава-фінансавага аддзела;

**ДЗЯМЕНЦЬЕВА** Ляля Аляксандраўна -- загадчыца канцылярыі;

**ОСІПАВА** Таццяна Іванаўна -- начальнік аддзела кадраў;

**СЕНІНА** Валянціна Фёдараўна -- ст. выкладчыца кафедры палітычнай сацыялогіі;

**ФЁДАРАВА** Марыя Еўдакімаўна -- машыністка I катэгорыі канцылярыі;

**ГАПЕЕВА** Марыя Данілаўна -- бібліёграф II катэгорыі;

**ГРАМЫКА** Ніна Фёдараўна -- рэдактар II катэгорыі бібліятэкі;

**САННІКАВА** Ганна Васільеўна -- ветэран працы;

**СМОЛІНА** Аляўціна Пятроўна -- ветэран працы;

**МАЛЬГІНА** Тамара Аляксандраўна -- ветэран працы;

**ХАДАЛЕВІЧ** Ірына Васільеўна -- ветэран працы;

**КАЛЕНІКАВА** Тамара Фёдараўна -- ветэран працы;

**КАПШАЙ** Марыя Мікалаеўна -- ст. навуковы супрацоўнік НДС;

**КОЛТЫШАВА** Надзея Іванаўна -- ст. выкладчыца кафедры беларускай культуры, старшыня прафкома студэнтаў.

***

За добрую вучобу і актыўную навуковую работу ўзнагароджаны граматамі і заахвочаны грашовымі прэміямі студэнткі:

**КАГАН** Святлана, другакурсніца філалагічнага факультэта;

**УС** Кацярына, пяцікурсніца біялагічнага факультэта;

**ШПЫРКО** Вольга, пяцікурсніца матэматычнага факультэта;

**САЛЬНІКАВА** Александрына, пяцікурсніца гісторыка-юрыдычнага факультэта;

**БУЛАВІК** Марына, пяцікурсніца эканамічнага факультэта;

**САЎЧАНКА** Алена, трэцякурсніца геолага-геаграфічнага факультэта;

**КУРДЗЕСАВА** Наталля, чацвёртакурсніца фізічнага факультэта.

**У маладзёжных арганізацыях**

# ШТО ЗРОБЛЕНА І АБ ПЛАНАХ НА БУДУЧАЕ

Адбылася справаздачна-выбарная канферэнцыя пярвічнай арганізацыі БПСМ ГДУ. На парадку дня былі справаздача камітэта БПСМ за справаздачны перыяд, выбары сакратара камітэта, унясенне змяненняў у састаў камітэта, абмеркаванне плана работы на 1998 год.

Справаздачу аб рабоце камітэта зрабіў Андрэй Гарбачоў, сакратар камітэта БПСМ. Па гэтаму пытанню выступалі таксама Н.І.Колтышава, старшыня прафкома студэнтаў універсітэта; А.Бартнеўскі, першы сакратар гарадскога камітэта БПСМ; К.Кекіш, студэнт трэцяга курса эканамічнага факультэта.

Студэнты, якія прысутнічалі на канферэнцыі, таксама праявілі актыўнасць пры абмеркаванні даклада, аб чым можна меркаваць па колькасці і якасці пытанняў, якія яны задавалі. А пыталі яны аб тым, што больш за ўсё набалела -- гэта і непастаянная работа буфетаў ва універсітэце, і планы БПСМ на будучыню, і льготы для членаў БПСМ, і г.д.

Пасля абмеркавання першага пытання была прынята пастанова: прызнаць работу камітэта БПСМ універсітэта здавальняючай.

Далей на парадку дня былі выбары сакратара камітэта БПСМ. Андрэй Гарбачоў, які стаяў ля вытокаў стварэння пярвічнай арганізацыі БПСМ у нашым універсітэце, заканчвае вучобу ў гэтым годзе, у сувязі з чым на апошнім пасяджэнні камітэта БПСМ ён прапанаваў на пасаду сакратара камітэта кіраўніка пярвічнай арганізацыі эканамічнага факультэта Паўла Серыкава. На канферэнцыі па гэтаму пытанню выступіў Кірыл Кекіш. У выніку галасавання пераважнай колькасцю галасоў сакратаром камітэта БПСМ універсітэта быў выбраны Павел Серыкаў, студэнт трэцяга курса эканамічнага факультэта, які выступіў і падзяліўся сваімі планамі работы, а затым уручыў першыя ва універсітэце членскія білеты БПСМ.

На канферэнцыі быў выбраны новы састаў камітэта БПСМ універсітэта. У яго ўвайшлі: Павел Серыкаў -- сакратар камітэта, Сяргей Раманчук (эканамічны факультэт), Святлана Талкачова (філалагічны факультэт), Васіль Даўжэнка (гісторыка-юрыдычны факультэт), Алена Яцэнкоўская (матэматычны факультэт), Андрэй Ходыраў (фізічны факультэт), Кірыл Кекіш ( эканамічны факультэт), а таксама старшыня прафкома студэнтаў Надзея Іванаўна Колтышава і начальнік аддзела выхаваўчай работы універсітэта Вячаслаў Пятровіч Гапееў.

Усе, каго падрабязна цікавіць дзейнасць БПСМ ва універсітэце і за яго межамі, а таксама ў каго ёсць якія-небудзь ідэі па паляпшэнню работы са студэнтамі і моладдзю ў цэлым, могуць звяртацца ў камітэт БПСМ (гал.корп., аўд. 4-10).

**Вольны час у інтэрнаце**

# З ГУМАРАМ І ВЫДАТНЫМ НАСТРОЕМ

У інтэрнаце N1 зарадзілася добрая традыцыя адзначаць святы дружным калектывам. Тут прайшоў вечар, прысвечаны Дню жанчын — 8 Сакавіка. Гэта быў прыемны сюрпрыз для ўсіх яго ўдзельнікаў. Усмешкі не зыходзілі з вясёлых твараў дзяўчат. Адказны за добры настрой — вядучы Сяргей Бальсевіч праводзіў захапляючыя гульні, не даючы доўга заседжвацца на месцы.

У гэты незвычайны вечар ва ўсіх з'явіўся шанс праверыць свае рэжысёрскія здольнасці, паэтычныя таленты. Маладыя людзі прадэманстравалі спрытнасць, умеласць, кемлівасць у конкурсе "Танец на газеце". Усе пераможцы ўзнагароджваліся салодкімі прызамі. На свята былі запрошаны работнікі культурнага цэнтра ГДУ Валянціна і Генадзь Вароніны, выхавацель інтэрната Міхаіл Бардашэвіч. Вялікае задавальненне атрымалі прысутныя, слухаючы песні ў выкананні Вароніных. Усе з ахвотаю падтрымалі прапанову Генадзя згуляць у "перапеўкі". Конкурс завяршыўся словамі: "Перамагла дружба!" Пасля "Агеньчыка" усе засталіся на дыскатэцы і працягвалі весяліцца.

Асаблівую падзяку за аказаную дапамогу ў арганізацыі і правядзенні вечара выказваем аддзелу выхаваўчай работы, прафкому студэнтаў — за спонсарскую падтрымку.

**К.ЯНКОВА, студэнтка II курса філалагічнага факультэта.**

МИР ЦВЕТОВ -- МИР ПРЕКРАСНОГО



# ОРХИДЕЯ

Она считается аристократическим цветком, а букет из орхидей — королевским подарком. Родина орхидей — тропические леса Южной Америки, Африки, встречаются они в Индии, на островах Океании, Мадагаскаре. Некоторые виды растут на почве, но большинство — эпифиты, то есть они поселяются на ветках деревьев, чтобы быть поближе к свету. Их микроскопические семена, попадая в трещинки коры деревьев, прорастают, корни их, спускаясь с веток, образуют "бороды". Поверхность корней с помощью специальной ткани впитывает влагу из воздуха. Стебель расширяется в основании, образуя так называемые "бульбы", из которых появляется цветонос.

Цветы большинства орхидей имеют шесть лепестков. Один из них, изгибаясь, образует губу, которая может принимать форму раковины, завитка, женской туфельки. Остальные лепестки бывают настолько необычной формы, что цветок может напоминать бабочку, паука, маленькую балеринку. Насекомое-опылитель, ориентируясь по привлекательному запаху и штрихам на губе, садится и всовывает головку внутрь цветка, двигаясь к нектарной ямке. В это время к его спинке прилипает пыльца и с ней оно летит на другой цветок, производя перекрестное опыление.

Европейцы ознакомились с орхидеями в конце XV — начале XVII в.в. Они были ошеломлены роскошью и разнообразием этих цветов. Трудности их поисков в тропических лесах, транспортировки и доставки с лихвой окупались — за особо редкий вид орхидей платили столько денег, сколько зарабатывал уэльский шахтер за 10 лет. В начале XX века была открыта возможность выращивания орхидей из семян на искусственных средах. Селекционеры создали множество межвидовых гибридов. Цветоводы освоили разведение орхидей в оранжереях и комнатных условиях.

Орхидея — "бриллиант" среди цветов и как всякая драгоценность требует соответствующей оправы: изящной упаковки, красивой хрустальной вазы. Она не терпит соседства других цветов — в ее букет лишь иногда добавляют зеленые ветки тропических оранжерейных растений. Срезают орхидеи в полном роспуске и сохраняются они в вазе до 20 дней.

Орхидеи вручают обычно в особо ответственных случаях: при объявлении помолвки, заключении деловых договоров, юбилярам, почетным гостям. Букет орхидей — роскошное украшение торжественного стола в небольшом зале, где красота формы цветов хорошо видна всем присутствующим. Один цветок орхидеи в специальном оформлении дарят обычно женщине, чтобы она в течение почти месяца могла наслаждаться утонченной красотой этого фантастического тропического цветка.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## ІЗНОЎ ПЕРШЫЯ

У спорткомплексе ПА "Гомсельмаш" прайшоў чэмпіянат Гомеля па пауэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю) сярод мужчын і жанчын.

У камандным заліку перамаглі студэнты нашага універсітэта, якія заваявалі пяць першых, два другія і тры трэція месцы.

На вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару падняліся: Раман Валетаў (52 кг) -- гісторыка-юрыдычны факультэт; Міхаіл Антропаў (56 кг) -- факультэт фізічнай культуры, Дзмітрый Струцінскі (67,5 кг) -- гісторыка-юрыдычны факультэт; майстры спорту факультэта фізічнай культуры Сяргей Гуцаў (90 кг) і Дзмітрый Глухотка (100 кг).

Да гэтага дадам, што нашу зборную трэніруе ст.выкдадчык кафедры фізвыхавання і спорту, нам.дэкана па спартыўна-масавай і выхаваўчай рабоце майстар спорту Уладзімір Галавач.

**М.ВІКТАРАЎ.**



## ЦІ ПАТРЭБНЫ НАМ ГАНДБОЛЬНЫЯ КАМАНДЫ?

Пяць дзён у гомельскім Палацы лёгкай атлетыкі праходзіў першы фінальны тур чэмпіянату Беларусі па гандболу сярод мужчынскіх каманд.

Па выніках гэтага тура чатыры лепшыя каманды будуць працягваць барацьбу за медалі чэмпіянату. Наша каманда "Універсітэт", займаючы пятае месца, не мела ніякіх шансаў перамясціцца на чацвёрты радок у турнірнай табліцы. І трэнер Віктар Марчук, кіруючыся тым, што наперадзе маладзёжныя рэспубліканскія гульні, увёў у састаў моладзь, якая прайшла добрую школу, сустракаючыся з лепшымі камандамі Беларусі.

Каманды СКА (Мінск), СКА (Мінская вобл.), "Аркатрон" і "Акадэмік" працягнуць барацьбу за медалі, а наша каманда і "Рубікон" будуць спаборнічаць за месцы з 5-га па 8-ае.

А зараз вернемся да назвы гэтай заметкі.

Дзесяць дзён у Гомелі праходзілі фінальныя гульні чэмпіянату Беларусі сярод жаночых і мужчынскіх каманд, дзе выступілі студэнты нашага універсітэта. На вялікі жаль арганізатараў чэмпіянату, сярод глядачоў не было не толькі выкладчыкаў універсітэта, але і студэнтаў.

Упэўнены, што дзве прайграныя сустрэчы нашай мужчынскай каманды з розніцай у два мячы поўнасцю ляжаць на сумленні балельшчыкаў, студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.

Зараз можна гаварыць усё: і не той час, і не тыя інтарэсы ў моладзі, і г.д. Але паўстае пытанне: чаму дэканат факультэта фізічнай культуры і спартыўны клуб не зрабілі нічога, каб выкладчыкі і студэнты прыйшлі падтрымаць сваю каманду? Чаму кафедра тэорыі і методыкі фізічнай культуры, за якой, дарэчы, замацаваны гандбол, пальцам не паварушыла, каб актывізаваць гэту работу? Няўжо было б цяжка расклеіць афішы ў інтэрнатах, паведаміць студэнтам (праз выкладчыкаў кафедры фізвыхавання і спорту) аб чэмпіянаце? Не былі ўстаноўлены прызы лепшым ігракам — студэнтам фінальных тураў.

У цэлым ёсць над чым задумацца ўсім, каму неабыякавы фізічная культура і спорт у нашым універсітэце.

У якасці прыклада спашлюся на чэмпіянат Беларусі па валейболу сярод жаночых каманд, які праходзіў у спорткомплексе "Гомельдрэў". Дык вось там у час гульняў гомельскай "Надзеі", як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Не здрадзілі балельшчыкі "Надзеі", калі спаборніцтвы былі ў гомельскім Палацы лёгкай атлетыкі. І яны гамяльчане, і мы называем сябе гамяльчанамі. Але ім неабыякава іх каманда, а наша, універсітэцкая, нікому не патрэбна.

**В.МАРЧАНКА,**
**ст.выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**

МЕДЫЦЫНА

## ЗАХАВАЦЬ ЗДАРОЎЕ ДАПАМОЖА... СОЛЬ

У нашай рэспубліцы працягвае заставацца высокай захворваемасць насельніцтва на эндэмічны валляк (эндемический зоб). Адной з прычын яе росту з'яўляецца недастатковае паступленне ёду ў арганізм, прыроднае ўтрыманне якога ў глебе, вадзе і прадуктах харчавання крайне нязначнае. Патрэба арганізма чалавека ў ёдзе можа быць задаволена за кошт паступлення яго ў саставе ёдаванай солі.

Меры, якія прымаюцца міністэрствамі, ведамствамі і прадпрыемствамі па забеспячэнню насельніцтва ёдаванай соллю і выкарыстанню яе ў вытворчасці прадуктаў харчавання, недастатковыя. У мінулым годзе мелі месца факты непаступлення харчовай ёдаванай солі на прадпрыемствы гандлю рэспублікі. Недастаткова было яе і ў гандлёвых кропках Гомельскай вобласці.

З мэтай прафілактыкі ёдадэфіцытных захворванняў сярод насельніцтва рэспублікі і кіруючыся Законам Рэспублікі Беларусь "Аб санітарна-эпідэмічным дабрабыце насельніцтва" прынята пастанова аб неадкладных мерах па бесперапыннаму забеспячэнню харчовай ёдаванай соллю прадпрыемстваў гандлю грамадскага харчавання ва ўсіх рэгіёнах, па забеспячэнню і выкарыстанню харчовай солі, узбагачанай ёдам, у тэхналогіі прыгатавання страў пры арганізацыі харчавання ва ўсіх тыпах навучальна-выхаваўчых, аздараўленчых, санаторных устаноў для дзяцей і падлеткаў, прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных, вышэйшых навучальных устаноў, лячэбна-прафілактычных устаноў, у санаторыях, на базах адпачынку, на прадпрыемствах грамадскага харчавання незалежна ад форм уласнасці.

Калі вы даражыце сваім здароўем, купляйце ў магазінах харчовую соль, узбагачаную ёдам. Яе выпускае ААТ "Мазырсоль".



СЁННЯ -- СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ З ТУБЕРКУЛЁЗАМ

## ХВАРОБА ВЯРТАЕЦЦА

Туберкулёз вяртаецца туды, дзе быў, здавалася, канчаткова перамажаны, а там, дзе ён яшчэ заставаўся, — перайшоў у наступленне. Ён, нібы войны і голад, працягвае знішчаць людзей.

Вось некаторыя факты. Сёння да двух мільярдаў чалавек заражаны туберкулёзам, узбуджальнікам якога з'яўляецца адзін з відаў бактэрый — туберкулёзная палачка. Больш таго, кожную секунду туберкулёзам заражаецца адзін чалавек. Па дадзеных Сусветнай арганізацыі здароўя ўсё больш людзей стануць ахвярамі туберкулёзу, устойлівага да лекавых прэпаратаў.

Адна з прычын вяртання туберкулёзу — рост колькасці бедных і галадаючых людзей, якія жывуць у перанаселеных гарадах развіваючыхся краін.

"Туберкулёзныя бактэрыі ёсць паўсюдна, — гаворыць доктар Арата Кочы, дырэктар Сусветнай праграмы Сусветнай арганізацыі здароўя ў барацьбе з туберкулёзам. — Калі хворы чыхае ці кашляе, у паветра трапляе шмат бактэрый — каб заразіцца, дастаткова ўдыхнуць яго ў сябе. Бактэрыі могуць заставацца ў паветры гадзінамі і нават гадамі. Таму ад туберкулёзу ніхто не застрахаваны. У арганізм чалавека трапляюць туберкулёзныя бактэрыі, і ён становіцца інфіцыраваным, затым інфекцыя перарастае ў захворванне. Трапляючы ў арганізм, бактэрыі пачынаюць размнажацца ў грудной клетцы. Аднак у 9 з 10 выпадкаў імунная сістэма перашкаджае распаўсюджанню інфекцыі, і чалавек не захворвае".

Зараз імунная сістэма людзей настолькі аслаблена, што не можа справіцца з інфекцыяй.

З дапамогай туберкулёнавай скурнай пробы можна вызначыць, ці ёсць у арганізме туберкулёзныя бацылы. Так праводзяць дыягностыку дзяцей і падлеткаў. Асноўным сродкам ранняга выяўлення туберкулёзу з'яўляецца штогадовая флюараграфія органаў грудной клеткі.

Ці прайшлі вы ў гэтым годзе флюараграфію?

**В.КАНАПЛІЦКАЯ,**
**заг.медпункта ГДУ.**


## ПРИХОДИТЕ НА ВЫСТАВКУ

**Гомельский государственный университет им.Ф.Скорины совместно с Гомельским клубом историко-технического стендового моделизма "Хобби" проводит выставку, которая состоится с 4 апреля по 12 апреля в выставочном зале главного корпуса по ул.Советская, 104.**

**На выставке будут представлены стендовые модели авиа-, авто-, железнодорожной, бронетехники различных масштабов, времен, стран, а также другие виды.**

**Это будет интересно не только детям, но и взрослым.**

***Посетите нашу выставку и вы не пожалеете.***

**Время работы выставки:**
**в будни -- с 11.00 до 19.00**
**в субботу и воскресенье с 10.00 до 16.00**


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
-- палітычнай сацыялогіі -- заг.кафедры;
-- батанікі і фізіялогіі раслін -- дацэнта;
-- агульнай фізікі -- дацэнта (0,25 стаўкі).

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 124.
Падпісана да друку 20.03.98.